Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 12 (312)



■ Вернісаж

# «ПРЫПАВЕСЦІ» З НАВІЦЫ

## Да 9 красавіка ў мастацкай галерэі «Інстытут культуры» працуе выстаўка Міжнародных майстар-класаў іканапісу ў Навіцы «Прыпавесці»

**Сорак мастакоў з Польшчы, Украіны, Славакіі, Беларусі і Грузіі з дапамогай сучасных выяўленчых сродкаў наноў знаёмяць гледача з біблейскімі прыпавесцямі.**



Наталля Лось. «Выгнанне з раю».

Ужо сем гадоў Таварыства сяброў Навіцы разам з кафедрай сакральнага мастацтва Львоўскай акадэміі выяўленчага мастацтва арганізуе тэматычныя пленэры. У польскім мястэчку Навіца збіраюцца мастакі з розных краін, каб сярод цішыні, спакою і малітвы разам шукаць натхненне для стварэння ікон. Кожны год арганізатары пленэраў абіраюць новую тэму для працы. На сустрэчах у Навіцы ўжо пісалі выявы Ісуса Хрыста, Божай Маці, апосталаў, надышоў і час прыпавесцяў Старога і Новага Запавету. Мастакі самі вырашалі, з якімі прыпавесцямі працаваць, якія матэрыялы выкарыстоўваць. Для іх няма ніякіх творчых абмежаванняў. Хтосьці ідзе ўслед за кананічным царкоўным майстэрствам, хтосьці эксперыментуе і малюе так, як падкажа яму сэрца. «Існуе ікона для храма, якая павінна быць кананічнай, і ікона хатняя, прызначаная для сямейнага ўжывання, — тлумачыць куратар праекта Катажына Якубоўска-Краўчык. — На нашай выстаўцы багата хатніх ікон, каля якіх хочацца маліцца звычайнаму чалавеку».

За некалькі тыдняў пленэра адбываецца значны культурны абмен: удзельнікі з'яўляюцца прадстаўнікамі не толькі розных мастацкіх кірункаў, але і нацыянальнасцяў. Арганізатары імкнуцца аб'яднаць хрысціян розных галін у адной творчай супольнасці, каб праз іх працу перадаць шматграннасць і разнабаковасць сакральнага мастацтва. Штогод знаходзіцца нешта новае. Сёлета здзівілі грузіны: іх іконы маюць непаўторную пластыку і выяўленчыя сродкі. Пасля завяршэння пленэраў большасць ікон едзе дадому разам з аўтарамі, частка захоўваецца для правядзення выставак. Некаторыя іконы трапляюць у царкву.

Беларуская мастачка Наталля Лось удзельнічае ў выстаўцы «Прыпавесці» разам з мужам і двума сынамі. На пленэры ў Навіцу іх сям'я выязджае ўжо не першы год. «Іконы могуць зацікавіць і тых, хто не чытае Біблію кожны дзень, — кажа Наталля. — У іканапісе існуюць свае сродкі, якія дапамагаюць «размаўляць» з чалавекам, нават калі ў яго няма грунтоўных рэлігійных ведаў. Іконы можна разгадваць, як рэбусы». На прыкладзе сваёй работы, іконы «Выгнанне з раю», мастачка паказала, як можна «чытаць» выявы непадрыхтаванаму гледачу. Яе бачанне раю — вялікае дрэва са смачнымі яблыкамі і прыгожымі белымі птушкамі. У цэнтры кампазіцыі змешчаны паўлін — сімвал вечнага жыцця, таму яго часта малююць у райскім садзе. Адам і Ева намаляваныя ўбаку. Яны парушылі закон, і вакол іх чорная прастора: першыя людзі сыходзяць у цемру. Над іх галовамі ляціць не белая птушка, а чорны крумкач з пяром паўліна — вечным напамінам пра страчанае шчасце.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ На сцэне

# «ЧЫСТЫ ГОЛАС» НА НОВЫ ЛАД

## Гурт рыхтуе новую праграму і збіраецца ў тур па краіне

**Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне», прафесійны вакальны ансамбль «Чысты голас» набліжаецца да свайго 25-годдзя. Нягледзячы на салідны ўзрост, калектыў не плануе з'яўляцца перад гледачом са старым і звыклым рэпертуарам. Выканаўцы падрыхтавалі новую канцэртную праграму «Гэта неба для нас!», з якой сёлета можна пазнаёміцца ў вялікіх і маленькіх гарадах Беларусі. Артысты сустрэліся з карэспандэнтам «Звязды» перад штодзённай рэпетыцыяй і падзяліліся сваімі планамі на бягучы год.**



Каманда «Чыстага голаса» складаецца з сямі чалавек. Гэта самі выканаўцы (тэнары Андрэй Пыжык і Дзмітрый Мінікаеў, барытоны Акім Тышко і Валерый Прыгун, бас Юрый Гузіч), гукарэжысёр Аляксей Тонкіх і дырэктар групы Святлана Дземядчук. За ўвесь час існавання ансамбля ў ім змяніліся толькі тры спевакі. «Мы не прыхільнікі «цякучкі» кадраў, бо калектыў павінен быць адзіным арганізмам, — тлумачыць Андрэй Пыжык. — За апошнія тры гады да нас прыйшлі два новыя артысты, таму да гэтага часу сольных канцэртаў у Мінску не было: чакалі, пакуль яны засвояць наш рэпертуар, прызвычайваліся адзін да аднаго, распрацоўвалі новую праграму». Паўза апынулася вельмі карыснай — цяпер гурт знаходзіцца на піку сваёй формы. З прыходам новых людзей з'явіліся новыя магчымасці: спевакі пачалі выконваць творы розных жанраў і рознага дыяпазону, узрос запас песень, што ў сваю чаргу пашырыла кола гледачоў.

Калі дваццаць гадоў таму рэпертуар «Чыстага голасу» складаўся з народнай і духоўнай праваслаўнай музыкі, якую спявалі a cappella, то цяпер ён павялічыўся настолькі, што можа зацікавіць не толькі аматараў класікі, але і сучасную моладзь. Акрамя традыцыйных кампазіцый на сцэне прагучалі сусветныя хіты накшталт «Yesterday» брытанскага гурта «The Beatles» (зразумела, у арыгінальнай апрацоўцы), аўтарская музыка, італьянскае папуры і фінская полька. Колькасць моў, на якіх напісаны песні з рэпертуару, — больш як паўтара дзясятка. У асноўным гэта мовы тых месцаў, дзе паспелі пабываць вакалісты, а гэта і краіны постсавецкай прасторы, і Злучаныя Штаты Амерыкі, і Еўропа. Як паказвае практыка, калі гурт дзесьці выступіў аднойчы, яго запросяць туды і другі, і трэці раз. Напрыклад, на 9 Мая «Чысты голас» зноў паклікалі на Далёкі Усход Расіі. Сустракаць свята Перамогі артысты будуць на востраве Сахалін.

Выканаўцы расказваюць, што аўдыторыя пачала заўважаць разнабаковасць іх творчасці, і ёй гэта падабаецца. Людзі выходзяць з канцэртаў з усмешкамі на тварах, бо паспяваюць і паразважаць над сур'ёзнымі кампазіцыямі, і адпачыць пад больш лёгкую, але не менш якасную музыку. «Да нас на канцэрты прыходзяць гледачы з рознымі густамі, і кожны з іх знаходзіць нешта для сябе, — сцвярджае барытон Акім Тышко. — Але ў выбары рэпертуару «Чысты голас» у першую чаргу абапіраецца на свой густ і захоўвае тыя песні, якія патрэбны для найбольш глыбокага разумення нашай творчасці».

У сваім туры гурт прадставіць і творы сучасных беларускіх кампазітараў. «Чысты голас» ужо шмат гадоў працуе з Алегам Молчанам (ён вядомы многім як кампазітар песні «Малітва», з якой Уладзімір Мулявін выступаў на «Славянскім базары»). Сумесных праектаў назбіралася столькі, што ў наступным годзе калектыў плануе выпусціць дыск з песнямі Алега Молчана. Асобае месца ў гастрольнай праграме зойме песня Рамана Козырава «Неба», якую той напісаў для ансамбля да адбору на Еўрабачанне. Радок з «Неба» даў назву ўсёй акцыі «Гэта неба для нас!». Для «Чыстага голасу» гэта не проста прыгожыя словы, а ўвасобленая сутнасць праекта. «Апошнім часам Беларусь ператварылася ў пляцоўку для вырашэння міжнародных праблем, і тое, што адбываецца ў глабальнай палітыцы, — важны і напружаны момант для ўсяго свету, — разважаюць удзельнікі ансамбля. — Таму мы жадаем нагадаць, што на нашай Радзіме спакон вякоў мірна суіснуе вялікая колькасць нацыянальнасцяў, і мы павінны быць удзячнымі за тое, што маем. «Гэта неба для нас!» — не толькі для беларусаў, але і для ўсіх людзей».

Такім чынам, слухачы, якія 5 красавіка прыйдуць на канцэрт «#Новы фармат» у Мінску, пабачаць зусім іншы «Чысты голас». Калектыў набыў сучаснае гучанне, але і не згубіў былыя традыцыі акапэльнай музыкі. Пасля сталіцы выканаўцы дадуць больш як пяцьдзясят канцэртаў ва ўсіх абласцях Беларусі. Праект зойме амаль увесь год: у маі «Гэта неба для нас!» прадставяць жыхарам Брэсцкай вобласці, у чэрвені з ім сустрэнецца Гродзеншчына, а восень плануюць адвесці пад тур па Магілёўскай і Віцебскай абласцях. Праграма кожнага выступлення будзе складацца індывідуальна. Напрыклад, у першыя дні мая будуць гучаць песні на ваенную тэму, асобны рэпертуар будзе падладжвацца і пад такія святы, як Дзень дзяцей і Дні горада ў розных раёнах. «Калі чалавек прыйдзе на нашы канцэрты ў розных гарадах, ён абавязкова ўбачыць нешта новае», — запэўніваюць спевакі.

За шмат гадоў сцэнічных выступленняў у «Чыстага голасу» нарадзіліся свае традыцыі. Так, выканаўцы часта ладзяць невялікі конкурс: яны выходзяць у залу і даюць гледачам праспяваць па куплетах якую-небудзь вядомую песню. Потым выклікаюць на сцэну ўсіх, хто ўдзельнічаў, абіраюць пераможцу і дораць музычны альбом групы. Для людзей гэта важна, бо ў такія моманты яны бачаць, што артысты не адмяжоўваюцца ад сваіх прыхільнікаў. Падчас выступлення вакальны ансамбль нават не звяртаецца па дапамогу да прафесійных вядучых. «Чысты голас» аддае перавагу непасрэднаму ўзаемадзеянню з публікай, сам вядзе ўсе мерапрыемствы. Жывыя галасы, жывыя эмоцыі робяць кожны канцэрт шчырым і непаўторным.

«У наступным годзе ансамблю споўніцца 25 гадоў. Звычайна калектывы ў такім сталым узросце падсумоўваюць вынікі, спяваюць стары правераны рэпертуар, — кажа тэнар Андрэй Пыжык. — У нас жа пачынаецца новы этап развіцця, і колькасць прыхільнікаў «Чыстага голасу» толькі расце. Мы бачым, што абралі правільны шлях».

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Не абмініце!

# КНІЖНЫЯ СПЕКТАКЛІ І ГУЛЬНІ

## У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіць фестываль «Горад і кнігі». Тэмай фэсту стала навука

**«Горад і кнігі» — гэта фестываль, які аб'ядноўвае кніжнікаў сталіцы, іншых гарадоў Беларусі і нават замежжа. Гэта агульная пляцоўка для ініцыятыў на літаратурную тэматыку. Тут прадстаўляюцца клубы і гурткі, хатнія тэатры са спектаклямі пра кнігі, незвычайныя гульні, літаратурныя экскурсіі па горадзе, паэтычныя вечарыны, цікавыя акцыі ў выдавецтвах, кнігарнях і бібліятэках. Упершыню фестываль «Горад і кнігі» прайшоў летась у Нацыянальнай бібліятэцы, ён сабраў больш як паўсотні цікавых літаратурных праектаў і 3,5 тысячы аматараў чытання.**

У якасці арганізатараў фестывалю сёлета выступаюць Навуковая бібліятэка БНТУ, Нацыянальная бібліятэка, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, праект «За чытанне».

— Раней у Беларусі не было кніжных фестываляў, якія аб'ядноўвалі б маленькія літаратурныя праекты, — распавядае **супрацоўніца Навуковай бібліятэкі БНТУ Вольга ВОЎК.** — Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш — прафесійны форум для вялікіх выдавецтваў, кнігарняў, але ж у нас існуе шмат дробных кніжных ініцыятыў. Яны таксама цікавыя і карысныя.

Фестываль «Горад і кнігі» літаральна вырас за некалькі гадоў з выстаўкі хэнд-мэйд герояў сучасных кніг «Усмешлівыя цуды» і яе суправаджальнай праграмы. Сёлета героі «Усмешлівых цудаў» таксама будуць на фэсце, яны размяшчаюцца ў адмысловым кардонным горадзе — маленькай копіі Мінска. Яго цягам месяца для фестывалю майстравалі валанцёры пад кіраўніцтвам майстра Юліі Кучынскай.

На якія мерапрыемствы, майстар-класы і прэзентацыі ў праграме фестывалю сёння варта звярнуць увагу?

Музей навукі «Elemento» правядзе майстар-класы і пакажа, што навука — гэта не сумна. Цягам усяго фэсту працуе стол з унікальнай літаратурнай настольнай гульнёй «Кнігаполія», якую распрацавала пісьменніца Надзея Ясмінска. Сэнс гульні ў тым, каб сабраць рэдкую калекцыю кніг на сваіх палічках. Баранавіцкая бібліятэка падрыхтавала працяг «Чароўных урокаў у Хогвартсе» па кнігах Джаан Роўлінг пра Гары Потэра. Як кажуць арганізатары, летась першая частка імпрэзы была надзвычай папулярнай.

Пісьменнікі Андрэй Жвалеўскі і Яўгенія Пастарнак разам з наведвальнікамі фестывалю паспрабуюць напісаць сцэнарый, кіруючыся законамі матэматыкі і логікі. Супрацоўнікі Санкт-Пецярбургскай бібліятэкі для сляпых правядуць майстар-клас па вырабе тактыльных кніг. Яны раскажуць, як з гэтымі кнігамі працаваць падчас імпрэзаў для дзяцей з парушэннямі зроку. Таксама на фестываль завітае Тамара Ігнацьева з Масквы. Яна правядзе майстар-клас «Ад першай літары да першай кнігі» і распавядзе, як лёгка і проста навучыць дзяцей чытаць.

На дзіцячай пляцоўцы пройдзе ценявы інтэрактыўны спектакль па часопісе «Трамвай» 1990 года ад дзіцячай кнігарні «Абажурчык» з Віцебска. А «Экалабараторыя» правядзе інтэрактыўныя заняткі для самых маленькіх «Дзіўнае цела».

Уваход на ўсе мерапрыемствы фестывалю бясплатны.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*